**Вольга Рынкевіч**

**Загадчык сектара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

# ПУБЛІЧНЫЯ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ ДА 70-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці публічных бібліятэк рэспублікі. Святкаванне 70-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і падрыхтоўка да 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне надалі новы імпульс рабоце бібліятэк.

Імкненне да годнага азнаменавання юбілейных дат паставіла перад бібліятэкарамі канкрэтныя задачы і, у першую чаргу, пошук новых форм, падыходаў і ідэй для арганізацыі і правядзеня шматлікіх сацыякультурных мерапрыемстваў. У выніку за 2013–2015 гг. у публічных бібліятэках рэспублікі адбылося больш за 15 тыс. мерапрыемстваў, прысвечаных ушанаванню народнага подзвігу ў гады ваеннага ліхалецця. На 2015 г. запланавана каля 10 тыс. разнастайных акцый, праектаў, сустрэч з ветэранамі, рэквіем-акцый, літаратурна-музычных вечарын, вечарын памяці, вечарын-партрэтаў, вахт памяці, дэкад памяці і славы, урокаў баявой славы, урокаў мужнасці, бібліямарафонаў, флэшмобаў, прэзентацый кніг, кніжна-ілюстрацыйных выстаў, выстаў-успамінаў, выстаў-заклікаў і інш.

Да 70-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў публічныя бібліятэкі сумесна з іншымі ўстановамі культуры прынялі ўдзел у рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Дорогами освободителей», грамадзянска-патрыятычнай акцыі «Мы памятаем! Мы ганарымся!». У 2014–2015 гг. публічнымі бібліятэкамі былі арганізаваны акцыі на абласных і раённых узроўнях (««Зноў Памяці звоняць званы»: чытаем верш па-беларуску» (Брэстская АБ), «Дарогамі спаленых вёсак» (Гомельская АБ і бібліятэкі Гомельскай вобл.). У многіх рэгіёнах рэспублікі на працягу мінулага і ў бягучым годзе праводзіцца акцыя «Чытаем кнігі пра вайну», накіраваная на далучэнне дзяцей і моладзі праз чытанне літаратуры ваеннай тэматыкі да незабыўнай старонкі гісторыі нашай Радзімы – Вялікай Айчыннай вайны і падзеям, што адбываліся ў той векапомны час. У рамках акцыі бібліятэкі Брэсцкай вобласці прынялі ўдзел у літаратурнай вахце памяці «Память о войне нам книга оживляет» (Бярозаўская раённая бібліятэчная сістэма), арганізоўвалі тыдні ваеннай кнігі «Этих дней не смолкнет слава» (Пінская раённая бібліятэчная сістэма), «Написано войной – увековечено литературой» (Пінская раённая бібліятэчная сістэма).

Менавіта са старонак кніг пакаленне, якое нарадзілася больш чым праз паўвека пасля Перамогі, можа даведацца пра подзвіг савецкіх салдатаў, мужнасць працаўнікоў тылу, усяго савецкага народа і пераняць эстафету памяці і павагі да стойкасці і гераізму продкаў, іх беззаветнай любові да сваёй Айчыны.

Разам з тым, сёння для падрастаючага пакалення яшчэ існуе амаль унікальная магчымасць сустрэцца з непасрэднымі ўдзельнікамі падзей Вялікай Айчыннай вайны, нягледзячы на тое, што да 70-гадовага юбілею Перамогі дажылі нямногія. Публічныя бібліятэкі імкнуцца здзяйсняць патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення на прыкладзе лёсу сваіх землякоў, што з'яўляецца найбольш яскравым і ўражвае юных удзельнікаў мерапрыемстваў.

Такія сустрэчы з удзельнікамі і відавочцамі Вялікай Айчыннай вайны арганізоўваюцца ў публічных бібліятэках як на рэгіянальным, так і на міждзяржаўным узроўнях. Яны спрыяюць зберажэнню калектыўнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і фарміраванню ў насельніцтва, асабліва ў дзяцей і моладзі, пачуцця патрыятызму, прыналежнасці да слаўнай гісторыі беларускага народа, гонару за здзейснены подзвіг дзядоў і прадзедаў.

Сярод мерапрыемстваў міждзяржаўнага ўзроўню можна адзначыць тэлемост Чавусы-Зеленаградск «Нам не дадзена забыцца», які адбыўся ў 2014 г. напярэдадні Дня Перамогі ў Чавускай цэнтральнай раённай бібліятэцы (Магілёўская вобл.) і быў ініцыяваны Зеленаградскай гарадской бібліятэкай Калінінградскай вобласці. Яго галоўным удзельнікам стаў ганаровы грамадзянін Зеленаградска, ветэран Вялікай Айчыннай вайны У.І. Чарноў, які ўдзельнічаў у вызваленні Чавускага раёна. На красавік 2015 г. запланаваны візіт прадстаўнікоў маладога пакалення Зеленаградска ў Чавусы, наведванне мясцін, дзе гераічна змагаўся іх зямляк, і знакавага сярод падзей Вялікай Айчыннай Вайны Буйніцкага поля.

У Брэсцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы адбылася сустрэча з маскоўскім прафесарам, гісторыкам, пісьменнікам А.А. Чароміным, якая прайшла пад дэвізам «Страницы этих книг – история войны». На сустрэчы аўтар прадставіў вучням свае новыя кнігі, прысвечаныя асобным старонкам гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У 2014 г. да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў у Брэсцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы адбыўся вечар-прэзентацыя «Пусть не умолкнут колокола памяти». Сваю кнігу ўспамінаў «О прожитом и пережитом» прадставіла Лідзія Валковіч. Яе

аповед пра пакуты, у якасці вязня з нашыўкай «OST», на працягу двух гадоў у Германіі, Аўстрыі, Італіі пакінуў незабыўны след у сэрцах удзельнікаў сустрэчы.

У сістэме мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, асноўная частка інфармацыйна-асветніцкай дзейнасці публічных бібліятэк здзяйсняецца праз рэалізацыю разнастайных бібліятэчных праектаў. Незалежна ад рэгіянальнага ўзроўню іх аб'ядноўвае галоўная мэта – праз кансалідацыю намаганнняў усіх зацікаўленых арганізацый і ўстаноў – удзельнікаў праектаў не даць сыйсці ў нябыт праявам велічы подзвігу і моцы духу савецкага народа на пакутным шляху да Перамогі, перадаць эстафету памяці сённяшняму і наступным пакаленням, унукам і праўнукам тых, хто коштам свайго жыцця адваёўваў мірнае жыццё для народаў краін Еўропы.

Публічныя бібліятэкі рэспублікі з'яўляюцца арганізатарамі праектаў па аказанні сацыяльна-бытавой дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна рэалізуе праект «Для вас, ветэраны!». Мэтай праекта з'яўляецца забеспячэнне ветэранаў вайны і працы, інвалідаў, якія пражываюць у Магілёўскім спецыяльным доме для ветэранаў, сацыяльна значнай інфармацыяй і арганізацыя іх вольнага часу. Супрацоўнікі бібліятэкі штомесяц наведваюць Дом ветэранаў з мерапрыемствамі, выдаюць кнігі, аўдыякнігі і часопісы.

У публічных бібліятэках Магілёўскай вобласці з 2014 г. пачалася рэалізацыя бібліятэчных праектаў па ваенна-патрыятычным выхаванні: «Гісторыя, авеяная славай» (Бабруйская гарадская бібліятэчная сістэма), «Памяць вайны стукае нам у сэрца» (Бялыніцкая раённая бібліятэчная сістэма), «Трагедыя асіповіцкіх вёсак» (Асіповіцкая раённая бібліятэчная сістэма), «Дакраніся да подзвігу сэрцам» (Клімавіцкая раённая бібліятэчная сістэма).

У бібліятэках Мінскай вобласці рэалізуюцца доўгатэрміновыя праекты: «70 патрыятычных спраў» (Бярэзінская раённая бібліятэчная сістэма, 2014–2015 гг.), «И память подвига нам книга оживляет» (Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка, 2014–2016 гг.), «Жыве народ, пакуль жыве яго гістарычная памяць» (Вілейская раённая цэнтральная бібліятэка, 2011–2015 гг.), «Вечны агонь памяці» (Лагойская раённая бібліятэчная сістэма, 2014–2015 гг.), «Перамога ў імя тых, хто жыве» (Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка, 2014–2015 гг.).

Падзеі ваеннага часу не забыты – яны занатаваны на старонках кніг, ажываюць ва ўспамінах ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Аднак публічныя бібліятэкі бачаць у агульнай дзейнасці па зберажэнні памяці аб падзеях ваеннага часу і сваю асаблівую місію – зберагчы памяць аб Вялікай Айчыннай вайне на прыкладзе мясцовага, краязнаўчага матэрыялу, каб праз дакументы і занатаваныя ўспаміны перадаць нашчадкам пачуццё глыбокага патрыятызму і непадкупнай любві да сваёй Радзімы. У сувязі з гэтым краязнаўчая дзейнасць бібліятэк набывае новы імпульс і скіравана на захаванне матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны нашых сучаснікаў ветэранаў-землякоў.

Гомельская абласная бібліятэка рэалізуе краязнаўчы літаратурна-мастацкі праект «Жывая памяць маёй сям'і», у рамках якога адбыліся мастацкія выставы, літаратурна-мастацкія вечарыны, творчыя партрэты і іншыя мерапрыемствы. Асноўным мерапрыемствам стаў патрыятычны марафон «Вайна ў лёсе маёй сям'і», цэнтральнае месца якога займала перасоўная выстава-прагляд з электроннай прэзентацыяй на аснове дакументальных матэрыялаў з сямейных архіваў.

У публічных бібліятэках Брэсцкай вобласці ажыццяўляюцца краязнаўчыя праекты і праграмы, накіраваныя на ўшанаванне імёнаў землякоў, зберажэнне памяці незабыўных ваенных старонак свайго краю: праект «Шёл мой край дорогами войны» (Пружанская раённая бібліятэчная сістэма), краязнаўчая мэтавая праграма «Памяць Маларытчыны» (Маларыцкая раённая бібліятэчная сістэма) (2011–2015 гг.), раённы праект «Великая Отечественная война в лицах» (Камянецкая раённая бібліятэчная сістэма) (2013–2015 гг.) і інш.

У 2013–2014 гг. у бібліятэках Гомельскай вобласці была арганізавана акцыя «Сохраним память» (Кармянская раённая бібліятэчная сістэма, Гомельская гарадская бібліятэчная сістэма). У час яе жыхары вобласці прыносілі ў бібліятэкі фотаздымкі бацькоў, дзядоў, прадзедаў – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, зробленыя непасрэдна ў перыяд 1941–1945 гг. Падчас акцыі было сабрана 440 фотадакументаў. Усе яны са згоды ўдзельнікаў акцыі размешчаны на сайце Гомельскай цэнтральнай бібліятэкі.

Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у рабоце бібліятэк садзейнічае распаўсюджванню краязнаўчай інфармацыі аб гісторыі і падзеях Вялікай Айчыннай вайны сярод шырокага кола насельніцтва і асабліва ў асяродку маладога пакалення. Адным з буйнамасштабных праектаў, рэалізаваных Віцебскай абласной бібліятэкай за перыяд з 2013 па 2015 г., з'явілася стварэнне і прэзентацыя паўнатэкставай базы даных (БД) «Дарогамі вызвалення Віцебшчыны». Асноўнай мэтай рэсурсу стала захаванне памяці пра гераічныя подзвігі воінаў, партызан і падпольшчыкаў, якія прымалі ўдзел у вызваленчай барацьбе насельніцтва Віцебскай вобласці супраць фашызму. У БД выкарыстаны матэрыялы больш за 200 кніг з фонду Віцебскай абласной бібліятэкі, алічбаваныя дакументы, артыкулы з перыядычных выданняў, карты, фотаздымкі.

Вельмі актыўна ў напрамку патрыятычнага выхавання ў віртуальным асяроддзі працуюць бібліятэкі – метадычныя цэнтры гарадскога і раённага ўзроўняў. У Баранавіцкай цэнтральнай гарадской бібліятэцы Брэсцкай вобласці ў 2013 г. была распрацавана і прадстаўлена на сайце бібліятэкі віртуальная выстава «Баранавіцкае партызанскае злучэнне». Стварэнне ўласных сайтаў дазволіла значна пашырыць інфармацыйныя і выхаваўчыя магчымасці бібліятэк Магілёўскай вобласці. Лісты з фронту ўраджэнцаў Хоцімшчыны былі сабраны бібліятэкарамі ў выніку акцыі «Фронтовые письма – потомкам» і ў алічбаваным выглядзе прадстаўлены на сайце Хоцімскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ў раздзеле «70 лет – помним».

Быхаўская цэнтральная раённая бібліятэка з мэтай увекавечання гераічнага подзвігу быхаўчан размясціла на сайце бібліятэкі краязнаўчы інфармацыйны зборнік «Вялікая Айчынная вайна на Быхаўшчыне». На сайце Дрыбінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі прадстаўлены зборнік паэтаў Дрыбіншчыны «Живуча память о войне».

Падзеі, што адбываліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны на Крычаўшчыне, асветлены на інфармацыйным сайце Крычаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ў раздзеле «Крычаўшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Аднайменная віртуальная выстава раскрывае краязнаўчыя фонды бібліятэк і прадстаўляе дакументы аб гэтым перыядзе гісторыі раёна.

Увазе віртуальных наведвальнікаў бібліятэк прапанаваны выставы: «Перамога – тое слова, дзе мір і хлеб, і шчасце, і любоў (Мінская АБ), «Пра дні, якія не забыць» (Маладзечанская ЦРБ Мінскай вобл.) і інш.

На афіцыйным сайце Віцебскай абласной бібліятэкі да 70-годдзя Перамогі распрацаваны банер з інфармацыяй аб святочных мерапрыемствах і сацыякультурных праектах, якія будуць рэалізаваны на працягу 2015 г.

Інфармацыйныя тэхналогіі выкарыстаны бібліятэкамі Мінскай вобласці і ў стварэнні мультымедыйных прэзентацый і аглядаў літаратуры: «Старонкі гэтых кніг – гісторыя вайны» (Валожынская цэнтральная раённая бібліятэка), «Фронтовики в семейном альбоме» (Крупская цэнтральная раённая бібліятэка), медыяпадарожжаў да помнікаў і абеліскаў «Мы помним, друзья, все дороги войны» (Вілейская цэнтральная раённая бібліятэка), а таксама па баявых мясцінах «Тут кожны быў героем» (Лагойская раённая дзіцячая бібліятэка).

Лідская цэнтральная раённая бібліятэка Гродзенскай вобласці падрыхтавала мультымедыйную прэзентацыю «Вызваленне Ліды: гісторыя і памяць».

Актыўная работа вядзецца бібліятэкамі па фарміраванні электронных інфармацыйных рэсурсаў адпаведнай тэматыкі. Бібліятэкамі Мінскай вобласці створаны электронныя БД «Жывым – помніць», прысвечаная Першай і Другой сусветным войнам на тэрыторыі Міншчыны (Мінская АБ), «Вёскі, спаленыя ў гады вайны» (Жодзінская цэнтральная гарадская бібліятэка), «Дзяржыншчына геаічная» змяшчае звесткі аб Героях Савецкага Саюза – ураджэнцах Дзяржыншчыны, партызанскім і падпольным руху, персаналіі (Дзяржынская цэнтральная раённая бібліятэка) і інш.

Актывізацыі і ўдасканаленню дзейнасці публічных бібліятэк па грамадзянска-патрыятычным выхаванні насельніцтва спрыяюць разнастайныя рэгіянальныя конкурсы. Магілёўскай АБ з лютага 2014 г. па чэрвень 2015 г. абвешчаны абласны агляд-конкурс на лепшую пастаноўку работы бібліятэк па ваенна-патрыятычным выхаванні «Жывая памяць пакаленняў», пераможцы якога будуць вызначаны сярод гарадскіх і сельскіх бібліятэк.

Раённыя конкурсы на лепшую пастаноўку работы па ваенна-патрыятычным выхаванні праводзіліся сярод бібліятэк Быхаўскай раённай бібліятэчнай сістэмы («Памяць вялікага подзвігу»), Мсціслаўскай раённай бібліятэчнай сістэмы («Мой край завецца Беларуссю») Магілёўскай вобласці.

З мэтай папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў, прыцягнення да чытання кніг ваеннай тэматыкі ў 2014 г. у бібліятэках Камянецкай раённай бібліятэчнай сістэмы Брэсцкай вобласці быў праведзены раённы агляд-конкурс на лепшае афармленне кніжнай выставы пад дэвізам «Не померкнет летопись Побед». У конкурсе прыняла ўдзел 31 бібліятэка раённай сістэмы публічных бібліятэк.

У бібліятэках Ашмянскай раённай бібліятэчнай сістэмы Гродзенскай вобласці ажыццяўляецца конкурс «Войны священные страницы навеки в памяти людской».

У Мінскай вобласці конкурс на лепшую арганізацыю кніжнай выставы, прысвечанай 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, праводзіцца сярод публічных бібліятэкі Смалявіцкага раёна. Конкурс на лепшую работу бібліятэк па папулярызацыі твораў літаратуры, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны «Гісторыі слаўнай вялікія даты», сярод публічных бібліятэк сістэмы абвясціла Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка.

Акрамя традыцыйных форм публічныя бібліятэкі рэспублікі з мэтай аддаць даніну памяці ўдзельнікам ваенных падзей і працаўнікам тылу, а таксама папулярызацыі сярод шырокіх колаў насельніцтва інфармацыйных рэсурсаў ваеннай тэматыкі, выкарыстоўваюць у сваёй рабоце разнастайныя інавацыйныя падыходы.

Гродзенская АБ у 2014 г. да дня Перамогі правяла тэатралізаваны дзень памяці «Па старонках ваенных часоў», які ладзіўся на тэрыторыі Новага замка, дзе разгарнуўся імправізаваны ваенны гарадок. Атмасферу ваеннага часу стварылі студэнты і школьнікі ў ваеннай форме, кадры відэахронікі, а таксама аўдыязапісы з фондаў бібліятэкі. Запрошаныя на мерапрыемства ветэраны, вязні канцлагераў, працаўнікі тылу прымалі ў ім самы актыўны ўдзел.

З мэтай папулярызацыі літаратуры, што ўслаўляе гераізм і мужнасць савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, на вуліцах і плошчах гарадоў і раённых цэнтраў Магілёўшчыны ў Дзень Перамогі і Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь працуюць бібліятэчныя пляцоўкі: «Была вайна. Была Перамога» (Чавуская раённая бібліятэчная сістэма), «Мінулых гадоў святая памяць» (Хоцімская раённая бібліятэчная сістэма), «Вехи памяти и славы» (Асіповіцкая раённая бібліятэчная сістэма).

У 2015 г. у Брэсцкай гарадской бібліятэчнай сістэме запланавана правядзенне гарадской акцыі «Читающий троллейбус» пад дэвізам «Памяць – помнік тым салдатам, што да Берліна не дайшлі». У рамках акцыі вядомыя людзі горада будуць чытаць вершы пра вайну, якія загучаць у спецыяльным тралейбусе, што будзе курсіраваць па розных маршрутах горада.

Актывізавалася і выдавецкая дзейнасць бібліятэк – метадычных цэнтраў. За перыяд 2013–2015 гг. публічнымі бібліятэкамі былі падрыхтаваны разнастайныя інфармацыйныя матэрыялы: метадычныя рэкамендацыі, біябібліяграфічныя дапаможнікі, інфармацыйныя дапаможнікі, інфармацыйна-краязнаўчыя зборнікі, зборнікі сцэнарных матэрыялаў, гісторыка-дакументальныя выданні, якія сталі вынікам дзейнасці публічных бібліятэк па патрыятычным выхаванні насельніцтва і падрыхтоўкі да святкавання незабыўнага для ўсяго беларускага народа юбілею з нагоды 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Хуткаплынны час няўмольны. Сярод нас засталося зусім няшмат тых, хто ў далёкім 1945 г. прынёс доўгачаканую Перамогу не толькі сваёй Айчыне, але і ўсёй сусветнай цывілізацыі. Сёння памяць аб тых падзеях жыве ў іх успамінах, а таксама на старонках кніг, у даследчых работах юных краязнаўцаў, у пажаўцелых лістах з фронту, у бляклых фотаздымках, архіўных дакументах, што месцяцца на кніжных выставах, тэматычных экспазіцыях бібліятэк і ў віртуальным асяродку. Усё гэта разам – гістарычная памяць народа пра Векапомныя дні, якая аб'ядноўвае пакаленні і з'яўляецца надзейным залогам будучыні.

Summary

The article is related to the activities of public libraries of the Republic of Belarus for the preparation and organization of events dedicated to the 70th anniversary of Victory in the Great Patriotic War of 1941–1945.